Верш Максіма Танка «Іудавы сярэбранікі», яркі ўзор інтэлектуальнай паэзіі і філасофскай лірыкі, прымушае чытача задумацца над узнятай паэтам праблемай, над якой можна развважаць бясконца, бо яна актуальная заўсёды.


**Бібліяграфічны спіс:**

1. Арочка, М. М. Максім Танк / М. М. Арочка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015. – Т. 3 : 1941–1965. – 2002. – С. 312–348.
2. Рагойша, В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : дапам. / В. Рагойша. – Мінск : Беларус. Энц., 2001. – 384 с.
3. Танк, М. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк / НАН Беларусі, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2006–2012. – Т. 6 : Вершы (1983–1995). – 2008. – 454 с.


## СПАЛУЧЭННЕ МІНУЛАГА І СУЧАСНАСЦІ Ў РАМАНЕ ІВАНА ШАМЯКІНА «СЭРЦА НА ДАЛОНІ»


***І. І. Андрушко***

*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», г. Мінск*

*Навуковы кіраўнік – Н. В. Заяц, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*



**Анатацыя.** У артыкуле даследуецца спецыфіка мастацкага часу ў рамане І. Шамякіна «Сэрца на далоні». Аналізуецца адметнасць сумяшчэння розных часавых пластоў (ваеннага мінулага і сучаснасці). Асаблівая ўвага звяртаецца на такі мастацмі прыём, як рэтраспекцыя. Мінулае ўводзіцца ў раман праз успаміны герояў: Антона Яраша, Зосі Савіч, а таксама Клаўдзіі Сухадол.



**Ключавыя словы:** рэтраспекцыя; мастацкі час; мастацкі прыём; І. Шамякін; «Сэрца на далоні»; доктар Яраш; доктар Савіч; Зося Савіч.


У літаратуры існуе вялікая колькасць твораў, дзе сумяшчаюцца розныя часавыя пласты, шырока выкарыстоўваецца прыём рэтраспекцыі. Па такім прынцыпе пабудаваны адзін з лепшых твораў народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна «Сэрца на далоні» (1960–1963), дзеянне у якім развіваецца паралельна ў двух часавых вымярэннях: у перыяд вайны і ў паслясталінскія гады.

Рэтраспекцыя – мастацкі прыём, прыгадванне падзей, калізій, якія папярэднічалі моманту фабулы, у якім знаходзіцца апавядальнік або персанаж эпічнага твора; адна з формаў псіхалагічнага аналізу, з дапамогай якой ствараецца мастацкі час [1].

Праз рэтраспектыўныя ўстаўныя навелы «Расказ Антона Яраша», «Хто ж такі доктар Савіч?», «Расказ Зосі Савіч» у твор уключаецца інфармацыя аб перыпетыях жыцця герояў у час вайны, што дапамагае раскрыць таямніцы нядаўняй гісторыі, паказаць сапраўдную сутнасць людзей і іх учынкаў. Разгледзім гэтыя навелы.

1. «Расказ Антона Яраша». З аповеда доктара Антона Яраша пісьменніку і журналісту Кірылу Шыковічу чытач даведваецца пра дзейнасць гарадскога падполля ў часы акупацыі, аб заданні ліквідаваць начальніка паліцыі Лучынскага, аб гібелі сябра Паўла. Малады Антон Яраш, кіруючыся помстай за сябра, задушыў Лучынскага, але быў паранены. Падпольшчык апынуўся ў доме Савічаў: «Я азірнуўся і... убачыў дом, у які мяне пацягнула нейкае асаблівае чуццё. У такія моманты з'яўляецца інтуіцыя, якая вядзе беспамылкова. Дом гэты стаяў не ў рад з іншымі дамамі, а ў глыбіні добрага саду. Прыгожы асабняк. Аднойчы я быў у гэтым доме. Прыходзіў здаваць экзамен гаспадару яго доктару Савічу» [2, с. 80]. Дачка доктара Зося схавала яго, вылечыла – выратавала яго жыццё.

Прыём рэтраспекцыі дапамагае не толькі спалучыць мінулае і сучаснае, але таксама выконвае функцыю псіхалагічнай матывацыі ўчынкаў герояў. Акрамя таго, з яго дапамогай выбудоўваецца дэтэктыўная інтрыга, адбываецца пагружэнне чытача ў твор – ён хоча даведацца, што адбудзецца далей.

2. «Хто ж такі доктар Савіч?». Збіраючы матэрыял для артыкула «Хто ж такі доктар Савіч?», пісьменнік Кірыл Шыковіч едзе ў вёску, дзе жыве былая медсястра Клаўдзія Сухадол. Ён робіць гэта з мэтай здабыць факты і доказы таго, што доктар не быў здраднікам, а наадварот, сваёй дзейнасцю дапамагаў падпольшчыкам. «...У той дзень, калі ўступілі немцы, у бальніцы заставаўся ён, Сцяпан Андрэевіч, ды я. Усе разбегліся. Нават хворыя паўцякалі, хто мог хадзіць. Але ў нас было чалавек дваццаць дызентэрыйных дзяцей. Доктар стараўся, каб эвакуіраваць іх. Ды каму хацелася браць у эшалон хворых з заразнай бальніцы?! Сцяпан Андрэевіч сказаў мне тады:

«Застанемся, Клаўдзя Сідараўна, на сваім пасту. Толькі баязліўцы пакідаюць пост у цяжкі момант» <…>« [2, с. 229].

3. «Расказ Зосі Савіч». У жаданні разгадаць тайну падполля Антон Яраш і Кірыл Шыковіч прыйшлі да Зосі, каб даведацца пра абставіны гібелі яе бацькі. Зося расказала, што аднойчы Сцяпан Савіч вярнуўся позна і сказаў ёй дапамагчы незнаёмаму чалавеку, схаваць яго ў іх доме. Незнаёмец назваўся дзяцькам Сажанем. Як выявіцца, гэтым чалавекам быў цяперашні старшыня гарсавета Гукан, што прыклаў шмат намаганняў, каб ачарніць доктара Савіча, назваўшы

яго нямецкім паслугачом, а пасля прынёс нямала пакут і самой Зосі. Цікава, што яшчэ ў тыя дні, калі лячыла Сажаня-Гукана, дзяўчына запомніла яго нядобры позірк – гэта дэталь лаканічна, але вельмі дакладна характарызуе героя.

Успаміны Зосі таксама дазваляюць зразумець жыццёвую філасофію Савіча, які заўсёды кіраваўся імкненнем служыць і дапамагаць землякам: «Я ведала: бацька сумленны чалавек. Але ці проста сумленны лекар ці змагар? Я здагадвалася, што нейкім чынам ён памагае нашым. Але як? Спрабавала гутарыць з ім пра гэта. Ён умеў адвесці размову ўбок. А разы два ўзлаваўся і загадаў, каб я не савала носа куды не трэба. «Малая яшчэ! – сказаў ён. – Не нам з табой займацца палітыкай. Не думай, што гэта рамантыка, як у кніжках. Ты ў мяне адна». Яшчэ тата часта казаў, каб я не думала, што ён служыць чужынцам, ён лячыў і лечыць сваіх людзей. А людзі – гэта самае каштоўнае, астануцца людзі – гісторыя не спыніцца і не пойдзе назад. Будуць жыць людзі – будзе жыць краіна і тая ўлада, якой народ даражыць» [2, с. 284].

Такім чынам, рэтраспекцыя ў рамане «Сэрца на далоні» – гэта адзін з галоўных прыёмаў, з дапамогай якога аўтар сумяшчае дзве эпохі, паказвае лёсавызначальны ўплыў падзей вайны на кожнага з персанажаў-сучаснікаў. Праз гісторыю доктара Савіча аўтар раскрыў злабадзённую і балючую праблему рэабілітацыі людзей, якія змагаліся з ворагам у падполлі, але такія, як Гукан, абылгалі іх і доўгі час хавалі праўду аб гісторыі горада і народа ў цэлым. Зварот да мінулага дапамог галоўным героям даведацца ісціну і вярнуць добрае імя чалавека, які годна служыў свайму народу.

**Бібліяграфічны спіс:**

1. Рэтраспекцыя [Электронны рэсурс] // Karotkizmest.by : сайт. – Рэжым доступу: https://karotkizmest.by/%D1%81%D0%BB%D0%BE%D1%9E%D0%BD%D1%96%D0%BA/%D1%80/%D1%80%D1%8D%D1%82%D1%80%D0%B0%D1%81%D0%BF%D0%B5%D0%BA%D1%86%D1%8B%D1%8F.html. – Дата доступу: 26.03.2023.

2. Шамякін, І. Сэрца на далоні : раман / І. Шамякін. – Мінск : Маст. літ., 20221. – 414 с.